Код, рабочий и мобильный телефон куратора __________________________
Программа выступления (перечень концертных номеров, продолжительность)
_________________________________________________________________

Руководитель /__________/ /_____________/
Подпись Расшифровка

М.П.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога пленэра па лозапляценні ”Лозовы прут“ у рамках Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога пленэра па лозапляценні ”Лазовы прут“ у рамках Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“ (далей – пленэр).

2. Пленэр праводзіцца ў мэтах стымулявання творчасці майстроў лозапляцення; далучэння да традыцый лозапляцення пачынаючых майстроў, папулярызацыі мастацкіх вырабаў з лазы; дэманстрацыі дасягненняў у развіцці дэкаратыўна-прыкладной творчасці дамоў (цэнтраў) рамёстваў; прыцягнення ўвагі моладзі да традыцыйнай культуры і творчасці вядучых майстроў Віцебскай вобласці па стварэнні вырабаў з лазы; фарміравання эстэтычнага густу насельніцтва на ўзорах творчасці майстроў Віцебшчыны.

3. Месца і дата правядзення: цэнтральная плошча г.Глыбокае, ліпень 2025 года.

4. Арганізатар: дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“; сектар культуры Глыбоцкага райвыканкама.

5. Арганізатары зацвярджаюць парадак арганізацыі і правядзення пленэра, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні.

6. Удзельнікі: майстры лозапляцення дамоў (цэнтраў) рамёстваў, члены народных клубаў і студый майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў устаноў культуры Віцебскай вобласці.

7. Парадак правядзення:

7.1. Заяўкі на ўдзел у пленэры дасылаюцца ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ на электронны адрас: amcnt@omcnt.by (з паметкай ”Лазовы прут“) да 7 ліпеня 2025 года. Да заяўкі дадаецца творчая характарыстыка аўтара.

7.2. Да 10 ліпеня 2025 г. арганізатары пленэру разглядаюць заяўку і інфармуюць аб згодзе на ўдзел.

7.3. Для ўдзелу ў пленэры майстры павінны мець з сабой хатнюю калекцыю вырабаў (5 – 10), матэрыл, інструменты і неабходнае абсталяванне для работы; ў дні ўдзелу ў пленэры павінны прадаставіць арганізатарам агульныя спіскі ўдзельнікаў у 2-х экзэмплярах (дадатак 1), якія абавязкова павінны быць завераны арыгінальным подпісам кіраўнка і пячаткай установы.

7.4. Майстры-ўдзельнікі павінннны быць апранутыя ў традыцыйныя строі свайго рэгіёна.

Удзельнікі пленэра працуюць тры дні:

1 дзень: заезд і рэгістрацыя да 11:00 (філіял №2 ”Глыбоцкі Дом рамёстваў“ ДУК ”Глыбоцкая цэнтралізаваная клубная сістэма“; вул.Гагарына, д.4). Абед і экскурсійная паездка па Глыбоцкім раёне з мэтай напрацовак мастацкіх вобразаў.

2 дзень: майстар-класы і абмен вопытам паміж майстрамі (згодна графіку) з 10:00 да 18:00. Праца на адкрытых для гледачоў пляцоўках (Цэнтральная плошча).

3 дзень: майстар-класы з 10:00 да 14:00 на адкрытых для гледачоў пляцоўках. Урачыстае закрыццё пленэра; бліц-выстава калекцый хатніх вырабаў майстроў і вырабаў, якія былі створаны падчас пленэру; узнагароджанне ўдзельнікаў дыпломамі з 15:00 да 16:00 на Цэнтральнай плошчы г. Глыбокае.

8. Удзельнікі пленэра, па жаданні, пакідаюць арганізатарам свой выраб у фонд. Дадзеная калекцыя будзе надрукавана ў альбоме-каталогу ”Майстры лозапляцення Віцебшчыны“.

9. Узнагароджанне:

9.1. Усе ўдзельнікі пленэру ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел, а пасля выдання альбома-каталога атрымліваюць 1 экзэмпляр.

9.2. Памятнымі прызамі ўзнагароджваюцца ўсе удзельнікі пленэру.

10. Фінансаванне:

10.1. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт арганізатараў у адпаведнасці

з каштарысам выдаткаў і дзеючым заканадаўствам.

10.2. Транспартныя выдаткі – за сродкі камандзіруючых устаноў.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8 (0212) 26-29-27.
**Тэлефон для даведак:** 8 (0212) 26-29-40 – Лапкова Таццяна Анатольеўна, загадчык аддзела традыцыйнай культуры.

*Дадатак 1*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел ў ______________________________________________**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць удзельнік) | |
| Намінацыя | |
| Тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
М.П. Подпіс Расшыфроўка

*Дадатак 2*

**СПІС**
**ўдзельнікаў ______________________________________________**

17 – 19 ліпеня 2025 г. г.Глыбокае

| п/п | Фамілія, Імя, Імя па бацьку **(на двух мовах)** | Год нараджэння | Адрас | Удзел |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Олегова Ольга Олеговна (Алегава Вольга Алегаўна) | 1970 | г. Витебск, ул. Чапаева, 8. | Удзельнік |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
М.П. Подпіс Расшыфроўка

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзенні абласной выставы-конкурсу галаўных убораў ”Справа ў капелюшы“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выставы-конкурсу галаўных убораў ”Справа ў капелюшы“ (далей – выстава-конкурс).

2. Выстава-конкурс праводзіцца ў мэтах вывучэння і аднаўлення традыцыйных галаўных убораў жыхароў Падняпроўя, Падзвіння і Паазер’я, правядзення этнаграфічных даследаванняў супрацоўнікамі Дамоў (цэнтраў) рамёстваў, стымулявання творчай актыўнасці членаў клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў Віцебскай вобласці, заахвочвання моладзі да вывучэння традыцыйнай народнай культуры.

3. Месца і час правядзення выставы-конкурсу – г.Глыбокае, падчас Міжнароднага свята ”Вішнёвы фестываль“.

4. Арганізатарамі выставы-конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. Арганізатары выставы-конкурсу зацвярджаюць парадак яе арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенню мерапрыемства.

5. Удзельнікамі выставы-конкурсу з’яўляюцца: майстры народных мастацкіх рамёстваў і мастакі-аматары, якія прадстаўляюць Дамы (Цэнтры) рамёстваў Віцебскай вобласці, члены клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў.

6. Парадак правядзення.

a. На выставу прадстаўляюцца: дзявочыя вянкі, павязкі (скіндачкі), каптуры, каруны; жаночыя намёткі, чапцы, павойнікі, хусткі, шалі, абхінанкі; мужчынскія магеркі, аблавухі, брылі, картузы. Дзявочыя, жаночыя і мужчынскія галаўныя ўборы прымаюцца з розных матэрыялаў і традыцыйных тэхнік выканання. Пажадана каб экспанаты-рэплікі суправаджаліся фотаздымкамі арыгінала альбо тэкстам, які апісвае дадзеную традыцыю. Галаўныя ўборы акрамя платкоў і хустак павінны быць прадстаўлены на прыстасаваннях для экспанавання.

b. Прадстаўленыя на абласную выставу-конкурс аўтарскія творы павінны мець прышытыя біркі, экспазіцыйную этыкетку з поўнай анатацыяй (лагатып установы культуры, Дома рамёстваў, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, год нараджэння, назва твора, матэрыял, тэхніка выканання, памеры)

7. Намінацыі выставы-конкурсу:

Гран-пры;
”Лепшая рэпліка дзявочага галаўнога ўбора“;
”Лепшая рэпліка жаночага галаўнога ўбора“;
”Лепшая рэпліка мужчынскага галаўнога ўбора“;
”Галаўны ўбор – сімвал фестывалю“.

8. Узнагароджванне:

a. Журы Выставы-конкурсу ў сваіх ацэнках прадстаўленых экспанатаў,

прэзентацый і майстар-класаў кіруецца наступнымі крытэрыямі:

адпаведнасць народным традыцыям;

разнастайнасць матэрыялаў і тэхнік прадстаўленай калекцыі;

захаванне лакальных тэхналагічных адметнасцей;

завершаны мастацкі вобраз;

творчае развіццё тэхналогіі.

9. Усе ўдзельнікі выставы-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у электронным выглядзе. Дыпломамі ўзнагароджваюцца пераможцы выставы-конкурсу: Гран-пры, уладальнікі I, II, III месцаў (усяго I6 дыпломаў). Прызамі ўзнагароджваюцца ўладальнікі Гран-пры і I месца ў намінацыях (усяго 5 прызоў). Журы мае права пераразмеркаваць ўзнагароды па намінацыях, але агульная колькасць павінна адпавядаць аб'яўленай лічбе. Уладальнікі прызоў і дыпломаў могуць па жаданні пакінуць свае творы ў фонд ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“.

10. Заяўкі на ўдзел і спіс мастацкіх вырабаў дасылаюцца ў Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці (210026, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 35А, тэл./факс 8 (0212) 26-29-27, E-mail: amcnt@omcnt.by (выставы-конкурс ”Справа ў капелюшы“) да 27 чэрвеня 2025 года.

11. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт арганізатараў выставы-конкурсу ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам. Транспартныя выдаткі на дастаўку і вяртанне экспанатаў– за кошт камандзіруючых устаноў.

**Тэлефон для даведак:** 8 (0212) 26-29-40 – Перліна Ганна Вадзімаўна, загадчык сектара выставачнай дзейнасці.

*Дадатак 1*

**Заяўка**
**на ўдзел у абласной выставе-конкурсу галаўных убораў**
**”Справа ў капелюшы“**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць майстар) | |
| Назва арганізацыі і раёна, які прадстаўляе аўтар | |
| Назва твора | |
| Матэрыял,тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

*Дадатак 2*

Спіс
мастацкіх вырабаў
**на ўдзел у абласной выставе-конкурсу галаўных убораў**
**”Справа ў капелюшы“**

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па-бацьку аўтара | Назва ўстановы | Назва творчай работы | Намінацыя |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**аб правядзенні адкрытага конкурсу традыцыйных батлеечных калектываў ”Батлейка Патупчыка запрашае“ ў межах Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення адкрытага конкурсу традыцыйных батлеечных калектываў ”Батлейка Патупчыка запрашае“ ў межах Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“ (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах развіцця і адраджэння нацыянальных традыцый беларускай батлейкі, выяўлення і стымулявання дзейнасці аматарскіх тэатральных калектываў, рэжысёраў, выканаўцаў, мастакоў, працуючых у жанры тэатра лялек, стварэння новых батлеечных калектываў.

3. Конкурс мае статус адкрытага. Праводзіцца 9 жніўня 2025 года ў г.Докшыцы падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“

4. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама; ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, аддзел культуры .

5. Арганізатары конкурсу зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў; вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні мерапрыемства.

6. Умовы і парадак правядзення:

6.1. да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца традыцыйныя батлеечныя калектывы, якія выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці батлеечныя прадстаўленні, прызначаныя для дарослай і дзіцячай аўдыторыі з розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь;

6.2. тэматыка і формы выступлення: народна-камедыйныя бытавыя сцэны, інтэрмедыі, жарты і казкі;

6.3. працягласць выступлення павінна складаць не менш за 15 хвілін і быць абавязкова з зачынам;

6.4. конкурс праводзіцца на адкрытых пляцоўках, таму для выступлення неабходна ўлічваць наяўнасць гукаўзмацняльнай апаратуры.

6.5. Конкурс праводзіцца ў 2 этапы:

1 этап (адборачны): **да 7 ліпеня 2025 года** ўдзельнікі дасылаюць заяўкі ў фармаце WORD і спасылкі на відэа-матэрыялы конкурснага выступлення па ўстаноўленай форме (гл. Дадатак 1). Спецыялісты ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ праводзяць папярэдні прагляд канкурсных пастановак і вылучаюць удзельнікаў конкурсу;

2 этап (конкурсны): 9 жніўня 2025 года ў г.Докшыцы падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“ адбудуцца конкурсныя выступленні калектываў.

7. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

батлеечны спектакль;

батлеечнае прадстаўленне

8. Журы конкурсу.

8.1. Журы конкурсу фарміруецца з ліку спецыялістаў сферы культуры і тэатральнага мастацтва, якое ажыццяўляе адзнаку конкурсных выступленняў.

8.2. Адзнакі і рашэнне журы па выніках конкурсу фіксуецца ў пратаколе, які падпісваюць усе члены журы.

8.3. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

9.Крытэрыі адзнакі:

выбар драматургічнага матэрыяла;

адпаведнасць рэпертуара ўзросту і ўзроўню падрыхтоўкі выканаўцаў;

рэжысёрскае вырашэнне аўтарскага замысла;

мастацкае і музычнае афармленне спектакля, прадстаўлення;

акцёрскае майстэрства;

выразнасць выканання (лагічныя націскі, інтанацыя, дыкцыя, тэмп, тэмбр, эмацыйна-экспрэсіўная афарбаванасць выступлення).

10. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне ўдзельнікаў

10.1.Па выніках фінальнага конкурснага прагляду вылучаюцца: лаўрэаты I, II, III ступені ў кожнай намінацыі), астатнія ўдзельнікі конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі ”За зберажэнне нацыянальных традыцый“.

10.2.Журы адзначае дыпломамі лепшыя калектывы па дадатковых намінацыях:

лепшае сцэнічнае ўвасабленне традыцый беларускай батлейкі;

лепшая рэжысура;

лепшая сцэнаграфія;

лепшае музычнае афармленне;
лепшы спектакль для дзяцей і моладзі;
спалучэнне розных жанраў мастацтва;
лепшы лялечны акцёрскі ансамбль;
лепшая мужчынская роля;
лепшая жаночая роля;
лепшая эпізадычная роля;
прыз глядацкіх сімпатый;
самая крэатыўная лялька.

11. Журы можа не прысуджаць дыпломы лаўрэатаў той ці іншай ступені, дзяліць прызавыя месцы паміж канкурсантамі, прысуджаць іншыя дыпломы.

12. Фінансаванне на падрыхтоўку і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з каштарысам. Па выніках конкурсу лаўрэаты і намінанты конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і прызамі. Удзельнікі забяспечваюцца аднаразовым харчаваннем, камандзіровачныя і транспартныя выдаткі за кошт накіроўваючага боку.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ 210026, г. Віцебск, вул. Леніна, д.35а, e-mail: amcnt@omcnt.by. Даведкі па тэлефоне: 8 (0212) 26-29-41 галоўны рэжысёр Мульц В.С.

*Дадатак 1*

| **ЗАЯЎКА**<br>на удзел у адкрытым конкурсе традыцыйных батлеечных калектываў ”Батлейка Патупчыка запрашае“ ў межах Рэспубліканскага фестывалю сяброўства і мастацтва ”Две реки“ | |
|---|---|
| Назва калектыву-удзельніка, альбо Ф,І,І па-бацьку ўдзельніка | |
| Кіраўнік (Ф,І,І па-бацьку, мабільны тэлефон, e-mail | |
| Адрас і тэлефон установы (поўная назва) | |
| Намінацыя | |
| Агульная колькасць чалавек | |
| Назва нумара, аўтар, працягласць выступлення | |
| Тэхнічныя ўмовы | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*Подпіс* *М.П.*

- Удакладняйце наяўнасць заявак у спецыялістаў

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога свята аматарскіх аб'яднанняў ”Яблычны фэст“, прысвечанага Году добраўпарадкавання**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога свята аматарскіх аб'яднанняў ”Яблычны фэст“ (далей – свята).

2. Свята праводзіцца з мэтай падтрымкі сацыяльна значных творчых ініцыятыў аматарскіх аб'яднанняў (клубаў па інтарэсах) і прадугледжвае выкананне наступных задач: папулярызацыя брэндаў гарадоў і раёнаў Віцебшчыны сродкамі культуры; далучэнне насельніцтва да нацыянальных традыцый і духоўных каштоўнасцяў; стварэнне атмасферы творчага дыялогу і культурнага абмену сярод удзельнікаў свята; эстэтычнае і экалагічнае выхаванне насельніцтва сродкамі мастацтва.

3. Свята мае статус абласнога.

4. Свята праводзіцца **16 жніўня 2025 года.**

5. Месцам правядзення свята з'яўляецца тэрыторыя ўстановы культуры ”Мемарыяльны музей садавода-селекцыянера І.П.Сікоры“ ў в.Алашкі Шаркаўшчынскага раёна.

6. Арганізатарамі свята выступаюць: упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, сектар культуры Шаркаўшчынскага райвыканкама (далей – арганізатары).

7. Арганізатары свята зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні мерапрыемства.

8. Умовы і парадак правядзення:

8.1. у свяце прымаюць удзел аматарскія аб'яднанні (клубы па інтарэсах), непрафесійныя аматарскія калектывы мастацкай творчасці па розных жанравых накіраванасцях (колькасць да 7 чалавек). Удзел аматарскіх калектываў мастацкай творчасці з найменнем ”народны“ – абавязковы. Аматарскія аб'яднанні рыхтуюцца па намінацыях:

”Яблычны кірмаш“ – выстава-прэзентацыя страў і пачастункаў па арыгінальных рэцэптах свайго краю (працягласць да 5 хв.);

”Інтэрактыўны яблычны квэст“ – конкурс гульнёвых праграм аматарскіх аб'яднанняў (клубаў па інтарэсах) на пляцоўцы: гульні свайго рэгіёна, гульні дзяцей і бацькоў, вулічныя, рухомыя, спаборніцтвы на свежым паветры, сучасныя тэатралізаваныя з выкарыстаннем аб'ёмнага рэквізіту, раставых лялек яблынева-садавіннай тэматыкі (працягласць 10 хвілін);

”Яблычныя матывы“ – прэзентацыя вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для аздаблення музея І.П.Сікоры (да 1-2 хв.);

”Уся справа ў яблыку“ – выстава-прэзентацыя фотаздымкаў з выявай сімвала свята (да 1-2 хв.). Ацэньваюцца фотаработы, прадстаўленыя ў электронным фармаце JPEG з дазволам здымкаў 300 dpi, памерам не менш А4, 2000 Пікс. Фатаграфіі павінны быць актуальнымі (зробленыя не пазней за 2023 год), добрай якасці. Не дапускаецца наяўнасць на здымку даты, подпісаў, вадзяных знакаў, выкарыстанне фатаграфій з сеткі Інтэрнэт. Прымаюцца арыгінальныя работы з выявай яблыка, яблыні, людзей з яблыкамі, ураджаю яблыкаў, тэматычных яблычных кампазіцый, нацюрмортаў і г.д., што адлюстроўвае галоўную тэматыку свята. Фатаграфіі накіроўваюцца на адрас электроннай пошты: elenasemenido@yandex.by. Лепшыя фотаздымкі застаюцца ў фондзе музея І.П.Сікоры.

8.2 у праграме свята пройдзе трэці раз акцыя ”Яблыня міру“, дзе ўдзельнікі ўпрыгожваюць яблыню ў садзе Сікоры пажаданнямі ў выглядзе яблыкаў, выкананых у розных тэхніках, з надпісам ”Міра на зямлі“ (удзельнікі свята прывозяць яблыкі з сабой).

9. Для ўдзелу ў свяце **да 28 ліпеня 2025 года** ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ па адрасе: 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35а (e-mail: amcnt@omcnt.by, elenasemenido@yandex.by) прадстаўляюцца заяўкі, завераныя подпісам кіраўніка і пячаткай установы, сцэнарыі і фота згодна дадатку да Палажэння. Па выніках відэаадбору лепшыя з удзельнікаў будуць уключаны ў праграму выступленняў.

10. Для адзнакі конкурсных выступленняў і вызначэння пераможцаў у розных намінацыях конкурсу ствараецца журы. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца кожным членам журы, з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

11. Удзельнікі свята ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата I, II і III ступеняў у кожнай намінацыі, сувенірамі і прызамі:

за 1 месцы (4 шт.);

за 3 спецыяльных дыплома (3 шт.) – ”За адраджэнне і захаванне народных традыцый“, ”За крэатыўнасць у творчасці“, ”За яркую індывідуальнасць і самабытнасць“;

астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

12. Журы мае права не прысуджаць тое ці іншае званне, а таксама па выніках свята заявіць іншае (дзяліць прызавыя месцы, прысуджаць спецыяльныя дыпломы).

13. Сектар культуры Шаркаўшчынскага райвыканкама рыхтуе сцэнарый свята, выставу фотаздымкаў з выявай сімвала свята (друк і афармленне) і прадастаўляе пляцоўкі для правядзення мерапрыемстваў абласнога свята на тэрыторыі ўстановы культуры ”Мемарыяльны музей садавода-селекцыянера І.П.Сікоры“ ў в.Алашкі Шаркаўшчынскага раёна.

14. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт мясцовых бюджэтаў ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і каштарысам выдаткаў, прадугледжаным на правядзенне свята.

14.1. ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ забяспечвае харчаванне ўдзельнікаў згодна прадстаўленых спісаў, набывае прызы (або сертыфікаты) за 1 месца і спецыяльныя прызы (усяго ў колькасці 7 штук). Транспартныя выдаткі забяспечваюцца за кошт накіроўваючага боку.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“:210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35а, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл.:8(0212) 26-29-17 (Семяніда Алена Ігнацьеўна).

*Дадатак*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у абласным свяце аматарскіх аб’яднанняў**
**”Яблычны фэст“**

1. Горад/раён ________________________________________________________
2. Поўная назва ўстановы культуры____________________________________
3. Назва аб’яднання, калектыву мастацкай творчасці або ўдзельніка (на кожнага ўдзельніка па намінацыі – асобная заяўка) ________________________________________________________________________
4. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка аб’яднання, калектыву ________________________________________________________________________
5. Намінацыя, у якой прымаюць удзел ________________________________
6. Кантактныя тэлефоны адказнага, кіраўніка аб’яднання і адрасы электроннай пошты_________________________________________________
7. Сцэнарыі прэзентацыі страў і гульнёвых праграм, фота вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкаў з выявай сімвала свята (прадстаўляюцца ў электронным варыянце)____________________________
8. Агульная колькасць удзельнікаў і папярэдні спіс удзельнікаў (па стандартнай форме ў табліцы) ________________________________________________________________________

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога канкурсу ансамбляў песні і музыкі ”Жураўліны звон – 2025“**

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу ансамбляў песні і музыкі ”Жураўліны звон – 2025“ (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення і падтрымкі таленавітых выканаўцаў і музыкантаў, павышэння творчага майстэрства і выканальніцкай культуры ўдзельнікаў, выяўлення цікавых музычных твораў і іх распаўсюджвання сярод выканаўцаў, папулярызацыі творчасці беларускіх аўтараў і музыкантаў, выхавання добрага эстэтычнага густу.

3. Конкурс мае статус абласнога.

4. Конкурс праводзіцца ў верасні 2025 года ў межах экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“.

5. Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, сектар культуры Міёрскага райвыканкама.

6. Арганізатары зацвярджаюць парадак арганізацыі і здзяйсняюць непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу, прымаюць заяўкі на ўдзел, зацвярджаюць каштарыс выдаткаў, зацвярджаюць склад журы конкурсу, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні мерапрыемства.

7. Умовы і парадак правядзення:

7.1. Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца ансамблі народнай песні, ансамблі народнай музыкі і песні Віцебскай вобласці і іншых абласцей Рэспублікі Беларусь. Уладальнікі ”Гран-пры“ і дыпломаў ”Лаўрэат І ступені“ конкурсу 2024 года могуць удзельнічаць у якасці гасцей.

Узрост удзельнікаў ад 18 гадоў і старэй.

7.2. Конкурс праводзіцца па намінацыях:

”Ансамбль песні“;

”Ансамбль музыкі і песні“.

7.3. Кожны калектыў рыхтуе два конкурсныя нумары, тэмай якіх з’яўляецца адлюстраванне гістарычных падзей у жыцці нашай краіны, культурных традыцый, прыгажосці прыроды роднай Беларусі, лепшых рысаў характару яе людзей. У праграме могуць быць фальклорныя і народныя спевы, народныя песні ў сучаснай апрацоўцы, лепшыя ўзоры вакальна-харавога жанру мінулых гадоў, песні сучасных аўтараў, якія стылістычна адпавядаюць народным беларускім вакальным творам.

7.4. Ансамбль песні (дуэт, трыа, квартэт і г.д.) рыхтуе адзін нумар у суправаджэнні жывога гуку (інструментаў) або з выкарыстаннем фанаграмы ”-1“, а другі нумар абавязкова без суправаджэння (a capella).

7.5. Ансамбль музыкі і песні рыхтуе два нумары: адзін нумар – вакальны ў суправаджэнні ”жывога гуку“ (інструментаў) ці з выкарыстаннем фанаграмы ”-

1“ або без суправаджэння (a capella); другі нумар – інструментальны твор (”жывы гук“) – абавязкова апрацоўка народнай (пажадана беларускай) мелодыі.

7.6. Колькасны склад удзельнікаў у кожным з калектываў не павінен перавышаць 15 чалавек.

8. Заяўкі да ўдзелу ў конкурсе дасылаюцца не пазней за **22 жніўня 2025 года** (форма заяўкі дадаецца) на электронны адрас: **PauliuchenkoDarya@yandex.by** (ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“) з паметкай у тэме ”Конкурс ”Жураўліны звон“.

9. Для ацэнкі конкурсных выступленняў ствараецца журы, якое складаецца з ліку вядучых спецыялістаў жанру народнай музыкі і песні, выкладчыкаў і кіраўнікоў ансамбляў песні і музыкі.

9.1. Журы абласнога конкурсу вызначае лепшыя калектывы, якія ўзнагароджваюцца Гран-пры і дыпломамі лаўрэатаў I, II, III ступені ў кожнай намінацыі згодна п.7.2. дадзенай інструкцыі.

9.2. Лаўрэаты I ступені і ўладальнік ”Гран-пры“ ўзнагароджваюцца прызамі.

9.3. Канкурсанты, якія не занялі прызавыя месцы, атрымоўваюць дыплом ”За папулярызацыю музычнай і песеннай творчасці“.

9.4. Журы мае права пры неабходнасці пераразмяркоўваць узнагароды.

10. Фінансаванне падрыхтоўкі і правядзення конкурсу ажыццяўляецца за кошт мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з каштарысам выдаткаў і дзеючым заканадаўствам. Дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ забяспечвае аплату харчавання ўдзельнікаў конкурсу, набыццё і аплату прызоў для пераможцаў конкурсу, набыццё і аплату паперы для вырабу дыпломаў.

11. Транспартные выдаткі за кошт накіроўваючага боку.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“:210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35а, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл.:8(0212) 26-29-24 (Паўлючэнка Дар’я Віктараўна).

*Дадатак*

**Заяўка**
**на ўдзел у абласным конкурсе**
**ансамбляў песні і музыкі ”Жураўліны звон – 2025“**

1. Поўная назва калектыву (з базавай прыналежнасцю)
2. Вобласць, горад, раён
3. Намінацыя, у якой калектыў прымае ўдзел
4. Колькасць удзельнікаў (з улікам кіраўніка)
5. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву, тэлефон (расшыфраваць цалкам на беларускай і рускай мове)

6. Назва ўстановы, якая накіроўвае калектыў
7. Абсталяванне (колькасць мікрафонаў, колькасць крэслаў, патрэбна ці не падключэнне і г.д.)
8. Конкурсная праграма (спіс)

| № | Аўтар слоў і музыкі, аранжыроўка (цалкам расшыфраваць) | Назва твораў | Выкананне (жывы гук, фанаграмма, (a capella) і г.д. | Хранаметраж (агульны час гучання не больш за 8 хвілін) |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

9. Фота калектыву, творчая характарыстыка (абавязкова дадаецца асобным файлам)

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзенні абласной інтэрактыўнай выставы-конкурсу мастацкіх вырабаў ”Птушыны перапалох“ у межах экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной інтэрактыўнай выставы-конкурсу мастацкіх вырабаў ”Птушыны перапалох“ у межах экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“ (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах папулярызацыі традыцыйных мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі адметнасцямі, які адлюстроўваюць адзінства прыроды і чалавека ў мастацкай культуры; прыцягнення ўвагі моладзі да традыцыйнай культуры і творчасці вядучых майстроў; фарміравання эстэтычнага густу насельніцтва на лепшых ўзорах творчасці майстроў, аднаўлення старажытных традыцый мясцовага насельніцтва Віцебшчыны ў розныя храналагічныя перыяды, фарміравання высокай экалагічнай культуры; павышэння сацыяльнай актыўнасці ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя; уяўлення аб неабходнасці захавання прыроднага свету; паказаць значэнне птушак у прыродзе і іх практычнае значэнне для чалавека; прыцягнення ўвагі да праблемы аховы птушак.

3. Конкурс мае статус абласнога.

4. Час правядзення: верасень 2025 года.

5. Месца правядзення: г. Міёры, Віцебская вобласць.

6. Арганізатарамі конкурсу выступаюць упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

7. Арганізатары зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні конкурсу.

8. Удзельнікамі выступаюць майстры народных мастацкіх рамёстваў і мастакі з раёнаў і гарадоў Віцебскай вобласці; удзельнікі і лаўрэаты раённых, абласных, рэспубліканскіх выстаў і фестываляў; творчыя калектывы Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў Віцебскай вобласці; члены клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў.

9. Умовы і парадак правядзення.

9.1. Аддзелы (сектары) культуры гаррайвыканкамаў падаюць арганізатарам конкурсу да 1 верасня 2025 года заяўкі на ўдзел, творчыя характарыстыкі майстроў, спіс з фотаздымкамі вырабаў, якія будуць пададзены на конкурс, на электронны адрас ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (форма спіса і заяўкі дадаецца), а таксама ў дзень правядзення дастаўляюць конкурсныя работы па адрасе: Віцебская вобласць, г. Міёры, паўвостраў.

9.2. Майстры народных мастацкіх рамёстваў (аўтары конкурсных работ) павінны зрабіць эстэтычнае афармленне, відовішчна прадэманстраваць свае конкурсныя мастацкія вырабы.

9.3. Памеры прадстаўленных твораў народнай творчасці не абмяжоўваюцца, павінны быць падпісаны на адваротным баку экспаната і мець экспазіцыйныя этыкеткі з поўнай інфармацыяй (прозвішча, ініцыялы аўтара, год нараджэння, назва твора, матэрыял, тэхніка выканання, памеры). Пажадана выкарыстанне экалагічных матэрыялаў.

10. Намінацыі конкурсу:

”Лепшы птушыны домік (кармушка) для зімуючых птушак ці шпакоўня“

Выраб павінен быць функцыянальна зручным для птушак, дабротным, без шчылін, афармлены з мастацкім густам, арыгінальным па кампазіцыі, даўгавечным па канструкцыі, складаным ў тэхнічным выкананні, эстэтычным на знешні выгляд і можа мець крэатыўны інавацыйны дызайн. Кармушка абавязкова павінна быць з дахам, каб прыкрываць корм ад снега і дажджу. На конкурс прымаюцца завершаныя творы.

”Лепшая выява птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі“

Творы выяўленчага мастацтва, пано з пласкасной саломкі ці дрэва, кераміка, мастацкі роспіс, габелен, ткацтва, вышыўка, выцінанка і іншыя творы, выкананыя ў розных традыцыйных тэхніках);

”Лепшы сувенір свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“

11. Журы конкурсу.

11.1. Журы конкурсу фарміруецца з ліку спецыялістаў сферы культуры.

11.2. Адзнакі і рашэнне журы па выніках конкурсу фіксуецца ў пратаколе, які падпісваюць усе члены журы.

11.3. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

12. Узнагароджванне.

12.1. Усе ўдзельнікі конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі. Прызамі ўзнагароджваюцца ўладальнікі за І месца ў намінацыях, згодна п.10.

12.2. Журы мае права пераразмеркаваць ўзнагароды па намінацыях, але агульная колькасць павінна адпавядаць аб’яўленай лічбе.

12.3. Уладальнікі дыпломаў лаўрэатаў І ступені пакідаюць адзін з вырабаў на часовае захаванне ў фонд ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, якія потым будуць уручаны Дзяржаўнай прыродаахоўнай ўстанове ”Ельня“ або сектару культуры Міёрскага райвыканкама для стварэння экспазіцыі будучага музея.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“: 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8(0212) 26-29-25.
**Тэлефон для даведак:** 8(0212) 26-29-58 – Кіркавец Марына Аляксандраўна, вядучы метадыст аддзела традыцыйнай культуры.

*Дадатак 1*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел ў абласной інтэрактыўнай выставе-конкурсе мастацкіх вырабаў ”Птушыны перапалох“ у межах экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць майстар) | |
| Назва арганізацыі і раёна, які прадстаўляе аўтар | |
| Намінацыя | |
| Тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________

*Дадатак 2*

**СПІС**
**мастацкіх вырабаў на ўдзел ў абласной інтэрактыўнай выставе-конкурсе ”Птушыны перапалох“ у межах экалагічнага свята ”Жураўлі і журавіны Міёрскага краю“**

| № п/п | Найменне, фота выраба | Матэрыял, тэхніка выканання выраба | Памер выраба | Колькасць |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*Подпіс Расшыфроўка*

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб арганізацыі і правядзенні абласнога свята нацыянальных культур ”Нас з’яднала зямля Беларусі“ ў межах XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога свята нацыянальных культур ”Нас з’яднала зямля Беларусі“ (далей – свята) у межах XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.
2. Свята праводзіцца з мэтай фарміравання павагі да розных нацыянальных культур, гарманізацыі міжнацыянальных адносін сродкамі культуры і прадугледжвае выкананне наступных задач: знаёмства шырокіх колаў грамадскасці з самабытнай культурай народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у вобласці; павышэнне мастацкага ўзроўню творчасці ўдзельнікаў нацыянальных супольнасцяў; развіццё міжнацыянальнага сяброўства; папулярызацыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
3. Свята мае статус абласнога.
4. Свята праводзіцца ў лістападзе 2025 года.
5. Месца правядзення свята: дзяржаўная ўстанова культуры ”Бешанковіцкі раённы цэнтр культуры“. Адрас установы: г.п.Бешанковічы, вул.Камуністычная, д.5.
6. Арганізатары свята: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама; дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“; сектар культуры Бешанковіцкага райвыканкама (далей – арганізатары).
7. Арганізатары свята зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні мерапрыемства.

8. Умовы і парадак правядзення:

8.1. Свята праходзіць як абласны адборачны тур у межах XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

8.2. Для ўдзелу ў свяце **да 20 кастрычніка 2025 года** неабходна прадаставіць заяўкі ў ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ па форме (гл. дадатак 1) у электронным варыянце, аудыё- і відэанумароў, фота і характарыстыку ўдзельнікаў па электроннай пошце: elenasemenido@yandex.by (з паметкай – ”Нас з’яднала зямля Беларусі“).

8.3. Запрашэнні раённым і гарадскім аддзелам, сектарам культуры для ўдзелу ў абласным свяце будуць дасланы па выніках праслухоўвання і прагляду заяўленых матэрыялаў.

9. Удзельнікі свята і ўмовы іх удзелу:

9.1. У свяце прымаюць удзел творчыя прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў – індывідуальныя выканаўцы і калектывы нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў; майстры народных мастацкіх рамёстваў, аматарскія калектывы мастацкай творчасці ўстаноў і арганізацый культуры Віцебскай вобласці, якія з’яўляюцца носьбітамі нацыянальнай культуры, належаць да пэўнай этнічнай групы, могуць годна прадэманстраваць сваю нацыянальную творчасць.

Індывідуальныя выканаўцы і творчыя калектывы прадстаўляюць па 1 нумару: вершаваны твор (да 2 хв.), песню на сваёй роднай мове, інструментальны, танцавальны, тэатральны нумар (да 4 хв. кожны твор); майстры нацыянальнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці прэзентуюць выставу сваіх твораў: па вышыўцы, саломапляценні, роспісу па дрэве, ганчарству, выяўленчым мастацтве, жывапісу і г.д.; рэчаў хатняга ўжытку, нацыянальных рэліквій, па магчымасці праводзяць майстар-клас, продаж рамесных вырабаў; прадстаўляюцца выставы-дэгустацыі страў нацыянальных кухань.

9.2. Абавязковая ўмова – наяўнасць нацыянальнага касцюма, мова прадстаўлення нацыі. Касцюмы ўдзельнікаў падтанцоўкі (калі такая ёсць) таксама павінны адпавядаць заяўленай нацыянальнасці.

9.3. Праграма свята прадугледжвае: выставу дэкаратыўна-прыкладной творчасці; выступленні індывідуальных выканаўцаў і калектываў мастацкай творчасці.

10. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне ўдзельнікаў.

10.1. Для падвядзення вынікаў ствараецца абласное журы з ліку спецыялістаў дзяржаўнай установы ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ і спецыялістаў сферы культуры, якое ацэньвае працу і выступленне ўдзельнікаў па наступных крытэрыях:

высокамастацкае аздабленне нумара;

афармленне пляцовак выстаў;

адметнае ўвасабленне нацыянальнага каларыту сваёй супольнасці;

выканальніцкае майстэрства ўдзельніка.

10.2. Дыпломамі лаўрэатаў 1, 2 і 3 ступені ўзнагароджваюцца пераможцы ў наступных намінацыях:

вакал;

харэаграфія;

інструментальны жанр;

тэатральны жанр;

выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці;

прэзентацыя нацыянальных страў.

За 1-я месцы лаурэаты адзначаюцца прызамі (сертыфікатамі).

Астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі за захаванне нацыянальных традыцый.

11. Вынікі аб’яўляюцца пасля заканчэння свята. Падвядзенне вынікаў афармляецца пратаколам, які падпісваецца кожным членам журы.

12. Журы мае права не прысуджаць месца альбо па выніках заявіць іншае (дзяліць прызавыя месцы ў межах выдзеленых па колькасці, прысуджаць спецыяльныя дыпломы).

13. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

14. З ліку пераможцаў абласнога адборачнага тура журы вызначае ўдзельнікаў фінальных мерапрыемстваў XV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур у г.Гродна.

15. Сектар культуры Бешанковіцкага райвыканкама прадастаўляе для правядзення мерапрыемстваў абласнога свята пляцоўкі дзяржаўнай установы культуры ”Бешанковіцкі раённы цэнтр культуры“.

16. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт мясцовых бюджэтаў ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і каштарысам выдаткаў, прадугледжаным на правядзенне свята.

17. ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ забяспечвае харчаванне ўдзельнікаў згодна прадстаўленых спісаў і ўзнагароджанне прызамі за 1-я месцы ў шасці намінацыях. Транспартныя выдаткі забяспечваюцца за кошт накіроўваючага боку.

**Кантактная інфармацыя:**

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“:
210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, elenasemenido@yandex.by, тэл.: 8(0212) 26-29-17, вядучы метадыст Семяніда Алена Ігнацьеўна.

*Дадатак*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у мерапрыемствах абласнога свята нацыянальных культур ”Нас з’яднала зямля Беларусі“**
**ад ўстановы ________________________ (дакладная назва)**
(на кожнага ўдзельніка ці калектыў асобная заяўка)

**Індывідуальны выканаўца (прозвішча, імя, імя па бацьку) ці калектыў** – *указаць колькасць чалавек па спіску* **(дакладная назва калектыву і ўстановы)**
_______________________________________________________________
кантактныя тэлефоны,
прадстаўленая нацыянальнасць,
жанр выступлення,
назва і аўтары твора, хранаметраж (абавязкова),
музычнае суправаджэнне ці музычны носьбіт,
інфармацыя аб удзельніку (калектыве)
**Майстар ці ўдзельнік выставы (прозвішча, імя, імя па бацьку)** ___________
кантактныя тэлефоны,
прадстаўленая нацыянальнасць,
дата нараджэння,
від творчай дзейнасці, што патрэбна (стол ці інш.)

інфармацыя аб удзельніку.
**Характарыстыка ўдзельніка:**
змястоўная, цікавая інфармацыя аб калектыве ці ўдзельніку,
3-5 розных якасных фотаздымкаў у эл.варыянце для трансляцыі на экране падчас выступлення.
**Куратар ад установы ці аддзела (сектара):**
прозвішча, імя, імя па бацьку, кантактныя тэлефоны (службовы, мабільны), e-mail.

Подпіс кіраўніка ўстановы ________________
М.П.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу лялечных тэатраў і гульнёвых калектываў ”Лялечны свет“**

1. Дадзеным Палажэннем вызначаецца парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу лялечных тэатраў і гульнёвых калектываў ”Лялечны свет“ (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца адзін раз у два гады з мэтай развіцця і адраджэння нацыянальных традыцый беларускай батлейкі, выяўлення і стымулявання дзейнасці аматарскіх тэатральных калектываў, рэжысёраў, выканаўцаў, мастакоў, працуючых у жанры тэатра лялек, стварэння новых лялечных і гульнёвых калектываў.

3. Арганізатарамі конкурсу выступаюць: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама; ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

4. Конкурс праводзіцца ў лістападзе 2025 года ў ДУК ”Сенненскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“.

5. Арганізатары конкурсу зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні мерапрыемства.

6. Умовы і парадак правядзення:

6.1. У конкурсе абавязкова прымаюць удзел аматарскія лялечныя і гульнёвыя калектывы раённых, гарадскіх і сельскіх устаноў культуры вобласці, якія маюць найменне ”ўзорны“, ”народны“, альбо калектывы, якія прэтэндуюць на прысваенне наймення;

6.2. паказ конкурсных работ вядзецца толькі ”жывым“ гукам (без запісу), дазваляецца фанаграма музычных фрагментаў;

6.3. конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:
лялечны спектакль (працягласць да 30 хвілін);
лялечнае прадстаўленне (працягласць да 20 хвілін);

гульнёвая праграма для дзяцей (працягласць да 10 хвілін);

6.4. Кожны калектыў-удзельнік конкурсу рыхтуе для журы праграмкі (не менш за 5 асобнікаў з указаннем установы, назвы калектыву, назвы спектакля, аўтараў, дзеючых асоб і выканаўцаў з указаннем іх узросту – абавязкова!), рэжысёра і г.д.; фота-візітку калектыву фармату А2, а таксама буклет калектыву.

7. Для ацэнкі выступленняў і вызначэння пераможцаў ствараецца журы з ліку спецыялістаў галіны культуры і тэатральнага мастацтва, якое ацэньвае творчыя работы наступным чынам: лаўрэат I, II, III ступені ў кожнай намінацыі і па дадатковых намінацыях:

”Лепшае рэжысёрскае рашэнне лялечнага спектакля, прадстаўлення“;

” Лепшая сцэнаграфія лялечнага спектакля, прадстаўлення“;

”Лепшае сцэнічнае ўвасабленне нацыянальнай драматургіі“;

”Лепшая аўтарская работа“;

”Лепшы акцёрскі ансамбль“;

”Творчы дэбют“;

”Лепшая гульнёвая праграма на беларускай мове“

8. Пры вызначэнні пераможцаў конкурсу асноўнымі крытэрыямі з’яўляюцца: папулярызацыя беларускай нацыянальнай спадчыны; сучаснасць ідэі спектакля, яго маральная і эстэтычная накіраванасць; актуальнасць творчай задумы спектакля, гульнёвай праграмы для дзіцячай аўдыторыі; адпаведнасць магчымасцяў выканаўцаў выбранаму мастацкаму твору; кампазіцыйная цэласнасць спектакля, мастацкі ўзровень і стылістычнае адзінства; імправізацыя і актывізацыя дзяцей, ўменне валодаць рэквізітам.

9. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, лічыцца канчатковым і перагляду не падлягае.

10. Журы можа не прысуджаць дыпломы лаўрэатаў той ці іншай ступені, дзяліць прызавыя месцы паміж канкурсантамі, прысуджаць іншыя дыпломы.

11. Да 1 кастрычніка 2025 года ўдзельнікі дасылаюць заяўку, відэа-, фота-матэрыялы конкурснай работы. Фота- і відэаматэрыялы не вяртаюцца.

12. Фінансаванне на падрыхтоўку і правядзення конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з каштарысам. Па выніках конкурсу пераможцы кожнай з намінацый атрымліваюць прызы і дыпломы. Удзельнікі конкурсу забяспечваюцца аднаразовым харчаваннем, камандзіровачныя і транспартныя выдаткі за кошт накіроўваючага боку.

**Кантактная інфармацыя:**

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“
210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35а, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8(0212)26-29-27. Даведкі па тэлефоне: 8 (0212) 26-29-41 – Мульц Вольга Сямёнаўна, галоўны рэжысёр.

*Дадатак 1*

| Заяўка |
|---|

| на удзел у абласным конкурсе лялечных тэатраў і гульнёвых калектываў ”Лялечны свет“ | |
|---|---|
| Назва калектыву-удзельніка, альбо П,І,І па-бацьку ўдзельніка (з базавай прыналежнасцю) | |
| Адрас і тэлефон установы (поўная назва) | |
| Кіраўнік (П,І,І па-бацьку, тэлефон, e-mail) | |
| Намінацыя | |
| Агульная колькасць чалавек | |
| Назва прадстаўлення, аўтар, працягласць выступлення | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
М.П. Подпіс Расшыфроўка

**ПОЛОЖЕНИЕ**
**о порядке организации и проведения III областного видео-конкурса для хореографических коллективов (без наименований ”народный“, ”образцовый“) ”Мы танцевать хотим…“**

1. Настоящее Положение устанавливает порядок организации и проведения III областного видео-конкурса для хореографических коллективов (без наименований ”народный“, ”образцовый“) ”Мы танцевать хотим“ (далее – видео-конкурс).

2. Целями и задачами проведения видео-конкурса являются: развитие, популяризация и поддержка любительского хореографического искусства; выявление талантливых балетмейстеров, хореографических коллективов и исполнителей танца; раскрытие творческого потенциала детей и молодежи; формирование банка данных перспективных танцевальных коллективов на дальнейшее присвоение наименований ”образцовый“, ”народный“; повышение профессионального уровня хореографического мастерства коллективов художественного творчества и их художественных руководителей; обмен опытом, установление творческих контактов.

3. Организатором видео-конкурса является ГУ ”Витебский областной методический центр народного творчества“.

4. Организатор видео-конкурса утверждает порядок его организации и проведения, смету расходов; решает иные вопросы по проведению мероприятия.

5. Условия и порядок проведения:

5.1. Видео-конкурс проводится с 1 октября по 1 декабря 2025 года.

5.2. В видео-конкурсе принимают участие творческие коллективы, хореографические студии, кружки учреждений культуры, образования, дополнительного образования Витебской области без наименования ”образцовый“, ”народный“ в следующих возрастные группах:

детская (до 8 лет);

младшая (9 – 12 лет);

средняя (13 – 15 лет);

старшая (16 – 25 лет);

взрослая (от 25 лет).

5.3. Хореографические коллективы представляют конкурсную программу из 2-х номеров (продолжительность всей программы – не более 15 минут), в любой из представленных номинаций:

детский танец (участники детской возрастной группы):

народный танец;

народный стилизованный танец;

эстрадный танец;

современная хореография (модерн, джаз, джаз модерн, свободная пластика, степ, брейк-данс, хип-хоп и т.д.);

классический танец;

танцевальное шоу;

солисты и дуэты;

лучшая балетмейстерская постановка.

5.4. Программа выступления может представлять собой как отдельно взятые танцы, так и связанный блок танцев, объединенных какой-либо темой. Постановка танцев может быть осуществлена руководителем хореографического коллектива, либо заимствована у других хореографов и балетмейстеров с обязательным указанием в анкете-заявке имени автора (согласно Приложению №1 к настоящему Положению).

5.5. Техническое требование по записи видео:

5.5.1. Выступления принимаются в любых видео форматах. Разрешается использовать любительскую или профессиональную съёмку.

5.5.2. Конкурсная видеозапись должна отвечать следующим требованиям:

руководитель (или один из участников коллектива) перед исполнением конкурсной программы должен объявить название коллектива, учреждение, которое представляет коллектив, название хореографического номера;

на видеозаписи должна быть видна полностью композиция танца, целостная постановка хореографического номера;

конкурсная программа должна исполняться в формате концертного выступления без остановок;

видеосъемка должна производиться без выключения и остановки видеокамеры сначала и до конца исполнения конкурсной программы (последующий монтаж не допускается);

5.5. Видеозапись конкурсного выступления должна быть размещена на видеосервисе YouTube (youtube.com).

При загрузке видеороликов на YouTube необходимо указать:

В поле ”Описание“: город, район; название коллектива; название конкурса: ”областной видео-конкурс для хореографических коллективов (без наименования ”народный“, ”образцовый“) ”Мы танцевать хотим…“.

После размещения видео на сервесе YouTube, необходимо прислать

ссылку видеоролика на электронный адрес amcnt@omcnt.by до 1 декабря 2025 года.

5.6. Заявка на участие в видео-конкурсе заполняется по форме согласно Приложению №1 и направляется по электроннай почте amcnt@omcnt.by до 1 декабря 2025 года.

Для каждой номинации заявка заполняется отдельно.

6. Для оценки конкурсных выступлений создаётся жюри из числа ведущих высококвалифицированных специалистов, владеющих теорией, методикой и практикой работы с хореографическими коллективами.

7. Жюри оценивает каждое конкурсное выступление по следующим критериям:

исполнительское мастерство;

соответствие репертуара возрастным особенностям исполнителей;

сценичность (пластика, костюм, реквизит, культура исполнения);

артистизм, раскрытие художественного образа;

композиционное построение номера.

8. Результаты итогов видео-конкурса оформляются протоколом, который подписывается каждым членом жюри.

Решение жюри является окончательным и пересмотру не подлежит.

9. Победители видео-конкурса определяются в каждой возрастной группе по номинациям, определенным в п.5.3 настоящего Положения и награждаются дипломами I, II, III степени с присвоением звания ”Лауреата“, а также вносятся в перспективный план на присвоение наименований ”народный“, ”образцовый“ и приглашаются на различные мероприятия, проводимые ГУ ”Витебский областной методический центр народного творчества“.

Все участники, не ставшие победителями, награждаются дипломами за участие.

10. Финансовые условия конкурса:

Организационный взнос за участие (независимо от количества номинаций) в конкурсе составляет 5,00 рублей с человека.

К заявке прикладывается подтверждение оплаты организационного взноса. После подачи и регистрации заявки, конкурсная программа не может быть изменена, а оплата не подлежит возврату.

Оплата за участие в конкурсе осуществляется на р/с

Оплата за участие в конкурсе осуществляется на р/с ГУ ”Витебский областной методический центр народного творчества“:

210026 г. Витебск ул. Ленина,35а

р/с BY22BLBB36320300002319001001

в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»

по Витебской области

BIK BLBBBY2X

УНП 300002319 ОКПО 05561051

В графе *назначение платежа* необходимо указать: оплата за участие в III областном видео-конкурсе для хореографических коллективов ”Мы танцевать хотим…“ .

Данное Положение является представлением для оплаты за участие в видео-конкурсе. Подача заявок на участие в видео-конкурсе означает полное принятие правил данного положения.

**Контактные телефоны:** 8 (0212)26-29-41, МТС +375292128775 – ведущий методист ГУ ”Витебский ОМЦНТ“ Панэ Ольга Григорьевна.

*Приложение 1*

ЗАЯВКА
на участие во III областном видео-конкурсе для хореографических коллективов (без наименований ”образцовый“, ”народный“)
”Мы танцевать хотим…“

| | |
|---|---|
| Название коллектива | |
| Город (адрес) | |
| ФИО руководителя | |
| Контактные данные руководителя (телефон, e-mail) | |
| Краткая информация о коллективе (год создания, награды, звания, адрес сайта или страницы в социальных сетях, прочее) | |
| Номинация | |
| Возрастная категория | |
| Количество участников | |
| Программа (автор музыки, название композиции, хронометраж, постановщик, количество участников) | |

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласной выставы-конкурсу ”Аклады для абразоў. Традыцыі і сучаснаць“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выставы-конкурсу ”Аклады для абразоў. Традыцыі і сучаснаць“ (далей – выстава-конкурс).

2. Выстава-конкурс праводзіцца ў мэтах папулярызацыі традыцыйных мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з лакальнымі адметнасцямі; прыцягнення ўвагі моладзі да традыцыйнай культуры і творчасці вядучых майстроў; фарміравання эстэтычнага густу насельніцтва на лепшых узорах творчасці майстроў, аднаўлення старажытных традыцый мясцовага насельніцтва Віцебшчыны ў розныя храналагічныя перыяды.

3. Месца і дата правядзення: выставачная зала ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А), 24 студзеня – 21 лютага 2025 года.

4. Арганізатар: дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

5. Арганізатар зацвярджае парадак арганізацыі і правядзення выставы-конкурсу, каштарыс выдаткаў, вырашае іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні.

6. Удзельнікі: майстры дамоў (цэнтраў) рамёстваў, удзельнікі узорных студый і народных клубаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў устаноў культуры Віцебскай вобласці.

7. Парадак правядзення.

7.1. Асноўныя крытэрыі адбору вырабаў для ўдзелу ў выставе-конкурсе: цэласнасць кампазіцыі; адлюстраванне ў вырабе тэмы экспазіцыі; унікальнасць экспаната, арыгінальнасць ідэі мастацка-вобразнага рашэння; майстэрства выканання і ступень мастацкага самавыяўлення; наяўнасць неабходнага афармлення работ.

7.2. Заяўкі на ўдзел дасылаюцца ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ на электронны адрас: amcnt@omcnt.by (з паметкай ”Аклады для абразоў. Традыцыі і сучаснаць“) да 17 студзеня 2025 года. Да заяўкі дадаецца: творчая характарыстыка аўтара твора, каталожныя дадзеныя твора (фотаздымак твора, назва, год стварэння, матэрыялы і тэхніка выканання, памер). Дадаткова ўказваецца магчымасць правядзення майстар-класа з назвамі тэхналогіі. Для ўдзелу ў намінацыі ”Лепшая рэпліка ўнікальнага мясцовага артэфакта“ дадаткова экспануецца сам гістарычны артэфакт, або фотаздымак ці яго апісанне, іншыя краязнаўчыя або літаратурныя звесткі, экспедыцыйныя дадзеныя, запісы размоў са старажыламі. Пажадана прадставіць на выставу ўсе метадычныя распрацоўкі і выданні па даследаванні бытавання вырабу акладаў для абразоў, якія былі створаны калектывамі дома рамёстваў (клубаў, студый) за ўвесь час дзейнасці. Абразы з акладамі праваслаўнай канфесіі пажадана экспанаваць з традыцыйнымі ручнікамі-набожнікамі (”багавікамі“).

7.3. На выставу прадстаўляюцца аклады для абразоў у розных тэхніках мясцовых традыцый з выкарыстаннем матэрыялаў, якія ўжываліся для дэкору раней на Віцебшчыне.

7.4. Памеры прадстаўленых вырабаў не абмяжоўваюцца, павінны мець прыстасаванні для мантажу, быць падпісаны на адваротным баку экспаната і мець экспазіцыйныя этыкеткі з поўнай інфармацыяй (назва ўстановы з эмблемай, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара; год нараджэння; назва твора; матэрыял і тэхніка выканання; памер).

7.5. Завоз экспанатаў да 20 студзеня ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ па адрасе: г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А (сектар выставачнай дзейнасці).

7.6. Мантаж экспазіцыі здзяйсняюць супрацоўнікі ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

8. Намінацыі:

”Лепшая рэпліка ўнікальнага мясцовага артэфакта“;

”Лепшы аклад з натуральных раслінных матэрыялаў (салома, лыка і інш.)“;

”Лепшы аклад з паперы“;

”Лепшы аклад з дрэва“;

”Лепшы аклад з металу (фальгі і т.п.)“;

”Лепшы арыгінальны аклад з выкарыстаннем розных матэрыялаў“.

9. Журы.

9.1. Журы фарміруецца з ліку спецыялістаў сферы культуры, народнай творчасці і мастацтвазнаўства.

9.2. Адзнакі і рашэнне журы па выніках правядзення абласной выставы-конкурсу фіксуецца ў пратаколе.

9.3. Журы мае права пераразмеркаваць узнагароды па намінацыях, але іх агульная колькасць павінна адпавядаць заяўленай лічбе.

9.4. Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

9.5. Журы ў сваёй працы кіруецца наступнымі крытэрыямі:

адпаведнасць лакальным і рэгіянальным традыцыям;

завершаны мастацкі вобраз;

захаванне традыцыйных тэхналагічных асаблівасцяў і матэрыялаў, памераў вырабаў;

узровень выканальніцкага майстэрства (правядзенне майстар-класаў будзе мець дадатковую перавыжнасць перад іншымі канкурсантамі);

якасная разнастайнасць і колькасць прадстаўленых твораў.

10. Узнагароджанне.

10.1. Дыпломамі лаўрэатаў узнагароджваюцца ўладальнікі I, II, III месцаў у 6-ці намінацыях згодна п.8, прызамі – уладальнікі I месцаў у 6-ці намінацыях згодна п.8.

10.2. Астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

10.3. Уладальнікі дыпломаў лаўрэатаў I ступені пакідаюць адзін з вырабаў у фонд ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

11. Фінансаванне.

11.1 Фінансавае забеспячэнне з’дзяйсняецца са сродкаў абласнога бюджэта, прадугледжаных ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ на правядзенне мерапрыемства: папера для вырабу афіш і дыпломаў, прызы (падарункавыя сертыфікаты) уладальнікам I месцаў у 6-ці намінацыях выставы-конкурсу.

11.2. Транспартныя выдаткі на дастаўку і вяртанне твораў з неабходным абсталяваннем для экспанавання, прыезд канкурсантаў для ўдзелу ў майстар-класах – за кошт камандзіруючых устаноў.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“: 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8(0212) 26-29-27.
**Тэлефон для даведак:** 8(0212) 26-29-40 – Бабровіч Ніна Аляксандраўна, вядучы метадыст сектара выставачнай дзейнасці.

*Дадатак 1*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у абласной выставе-конкурсе ”Аклады для абразоў. Традыцыі і сучаснаць“**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць майстар) | |
| Творчая біяграфія майстра, фотаздымак за працай у майстэрні | |
| Назва арганізацыі і раёна, які прадстаўляе аўтар | |
| Намінацыя | |
| Тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*Подпіс Расшыфроўка*

М.П.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзенні абласной выставы-продажу жаночых упрыгожванняў ”Свет жанчын“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выставы-продажу жаночых упрыгожванняў ”Свет жанчын“ (далей – выстава-продаж).

2. Выстава-продаж праводзіцца ў мэтах папулярызацыі і агляду якасці традыцыйных утылітарных, дэкаратыўнаых жаночых упрыгожванняў і аксэсуараў, створаных майстрамі народных мастацкіх рамёстваў, майстрамі-рамеснікамі Віцебскай вобласці за апошнія тры гады дзейнасці; зацікаўленасці насельніцтва якаснымі творамі функцыянальнага (насібельнага, моднага) прызначэння, якія маюць своеасаблівыя рысы вобразаў старажытных і не вельмі даўніх часоў мясцовай жаночай сялянскай, местачковай і гарадской моды Віцебшчыны, якія захавалі яшчэ і функцыянальную былую ролю ў побыце, пераняслі зразумелы для любога чалавека сэнс карыснасці рэчы, экалагічнасці, прыгажосці, з’яўляюцца найлепшай рэччу для прапановы пакупнікам, падарункам для душы, на добрую памяць.

3. Выстава-продаж мае статус абласной.

5. Месца і дата правядзення: выставачная зала ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А), сакавік 2025 года.

6. Арганізатары: упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

7. Арганізатары выставы-продажу зацвярджаюць парадак яго арганізацыі і правядзення.

8. Удзельнікі: супрацоўнікі дамоў (цэнтраў) рамёстваў Віцебскай вобласці; члены студый і клубаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў пры ўстановах культуры Віцебскай вобласці, рамеснікі, самазанятыя і іншыя індывідуальныя асобы, якія займаюцца вырабам сувенірнай прадукцыі і маюць права рэалізоўваць свае творы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

9. Пры падрыхтоўцы экспанатаў да выставы-продажу майстрам рэкамендуецца надаць асаблівую ўвагу тым вырабам, якія спалучаюць у сабе традыцыю і сучаснасць, мастацкую і утылітарную функцыі. Пажадана, каб творы былі выкананы па рамесных тэхналогіях з экалагічных матэрыялаў і належылі да ўзораў найлепшых праяў традыцыі рамяства, побытавай рэчы ці твора народнай творчасці, з’яўляліся ўнікальнай рэччу лакальнай мясцовай матэрыяльнай культуры як беларусаў, так і іншых нацыянальных меншасцяў, якія пражывалі ў розныя часы на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці.

10. Парадак правядзення.

10.1. Асноўныя крытэрыі адбору вырабаў для ўдзелу ў выставе-продажу: адпавяданне мэтам і задачам (згодна пунктам 2, 8, 9); захаванасць традыцый, якасць вырабу, адлюстраванне гісторыі бытавання, асаблівасцяў рамесніцкіх прыёмаў, выкарыстанне мясцовай сыравіны і матэрыялаў, наяўнасць неабходных дакументаў для гандлю. Пры наяўнасці шэрагу прадметаў аднолькавай тэхнікі абавязкова трэба зрабіць аналіз калекцыі і прадставіць на выставу-продаж вырабы, якія дасканала характэрызуюць асартымент у варыятыўнасці традыцыйных форм.

10.2. Заяўкі на ўдзел дасылаюцца ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ на электронны адрас: amcnt@omcnt.by (з паметкай ”Свет жанчын“) да 1 сакавіка 2025 года. Да заяўкі дадаецца: характарыстыка вырабаў, каталожныя дадзеныя (назва ўстановы з эмблемай, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара; год нараджэння; назва твора; матэрыял і тэхніка выканання; памер).

10.3. На выставу-продаж прадстаўляюцца вырабы, адпаведна падрыхтаваныя для экспанавання, ў розных тэхніках і матэрыялах. Колькасць прадстаўленых прадметаў абмежавана магчымасцямі экспазіцыйнай залы ВАМЦНТ, а таксама іх якасцю і неабходнасцю экспанавання (неабходна папярэдняе ўзгадненне з куратарам па адбору для прадастаўлення вырабаў на выставу-продаж). Прадметы павінны мець прыстасаванні для мантажу, быць падпісаны на адваротным баку экспаната і мець экспазіцыйныя этыкеткі з поўнай інфармацыяй (указана ў п.10.2.).

10.4. Дастаўка экспанатаў на выставу-продаж да 3 сакавіка 2025 г. Мантаж экспазіцыі здзяйсняюць супрацоўнікі ДУ ”ВАМЦНТ“.

10.5. Гандль могуць ажыццяўляць як самі ўдзельнікі выставы-продажу, адначасова дэманструючы практыку стварэння сувенірнай рэчы, так і супрацоўнікі сектара па выставачнай дзейнасці ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“

11. Усе ўдзельнікі выставы-продажу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у электронным выглядзе.

12. Фінансаванне.

12.1. Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт арганізатараў выставы-продажу ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

12.2. Арганізатары выставы-продажу забяспечваюць набыццё паперы для вырабу афіш, рэкламнай прадукцыі.

12.3. Транспартныя выдаткі на дастаўку і вяртанне экспанатаў – за кошт камандзіруючых устаноў.

**Кантактная інфармацыя:**
ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“: 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8(0212) 26-29-27.
**Тэлефон для даведак:** 8(0212) 26-29-58 – Кіркавец Марына Аляксандраўна, вядучы метадыст.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**Рэспубліканскай выставы інсітнага (наіўнага) мастацтва ”Інсіта - 2025“, прысвечанай 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення Рэспубліканскай выставы інсітнага (наіўнага) мастацтва ”Інсіта – 2025“, прысвечанай 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (далей - выстава).

2. Выстава праводзіцца з мэтай стымулявання працэсаў развіцця інсітнага (наіўнага) мастацтва, выяўлення новых талентаў і спрыяння іх творчаму раскрыццю; папулярызацыі інсітнага мастацтва сярод шырокіх колаў грамадскасці; наладжвання творчага супрацоўніцтва ў галіне інсітнага мастацтва з установамі культуры суседніх краін; умацавання грамадзянскага адзінства; захавання гістарычнай памяці; стварэння высокамастацкай калекцыі героіка-патрыятычнай грамадзянскай тэматыкі.

3. Арганізатарамі выставы з’яўляюцца: дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу ”Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур“, упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова

”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, установа культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“ (далей – арганізатары).

4. Выстава мае статус Рэспубліканскай, прадугледжвае ўдзел творцаў з усіх абласцей Рэспублікі Беларусь і прадстаўнікоў з іншых краін.

5. Месца правядзення выставы: г.Віцебск, дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (далей ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“), установа культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“.

6. Арганізатары выставы вызначаюць парадак яе арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па яе правядзенню.

7. Удзельнікі: мастакі інсітнага мастацтва дамоў (цэнтраў) рамёстваў, члены народных клубаў і студый майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў устаноў культуры, члены Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

8. Тэматыка выставы абумоўлена яе прысвячэннем 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Дамінуючай тэмай з’яўляецца жыццё пасляваеннага часу, гераічныя подзвігі дзядоў і прадзедаў у баях за Радзіму, працаўнікоў тылу і дзяцей вайны, вобразы народных герояў і творцаў, адлюстраванне мірнага жыцця, дасягненні (прамысловыя, будаўнічыя, спартыўныя, асабістыя), якія сталі магчымымі, дзякуючы перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне. Творчыя работы могуць быць прадстаўлены ў графічных, жывапісных, пластычных творах, маляваных дыванах, арт-аб’ектах і інсталяцыях, арт-кнігах (аматарскія альбомы), разьбе па дрэве і іншых матэрыялах, выкананыя не раней 2021 года.

9. Намінацыі:

Гран-пры (узнагароджваецца калектыў дома (цэнтра) рамёстваў, калектыў майстроў альбо асобны мастак (мастак-майстар) за лепшую калекцыю прадстаўленых твораў);

”Подзвіг родных і блізкіх падчас Вялікай Айчыннай вайны“;

”Мая сям’я: вобраз продкаў“;

”Мірнае неба над маім краем“;

”Памяць у сэрцы маім“ – спецыяльная намінацыя на прыз глядацкіх сімпатый, будзе ацэнена наведвальнікамі выставы.

У кожнай намінацыі выдзяляецца адзін аўтар, альбо калектыўная работа.

10. Заяўкі на ўдзел у выставе дасылаюцца да 1 красавіка 2025 года ў ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ на электронны адрас amcnt@omcnt.by па форме (Дадатак 1) з паметкай ”Выстава інсіта – 2025“. Да заяўкі абавязкова дадаюцца творчыя біяграфіі мастакоў і каталожныя дадзеныя твораў (назва твора, год стварэння, матэрыялы і тэхніка, памеры), файлы з фота прапануемых твораў для экспанавання, фотаздымкамі аўтараў.

11. Завоз экспанатаў і спісаў да 20 красавіка 2025 года у ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ па адрасе: вул.Леніна, д. 35А, г.Віцебск, Беларусь, 210026.

12. Прадстаўленыя на выставу аўтарскія творы павінны мець экспазіцыйную этыкетку з поўнай анатацыяй (лагатып установы культуры, Дома (Цэнтра) рамёстваў, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, год нараджэння, назва твора, матэрыял, тэхніка выканання, памеры).

13. Аддзелы і сектары культуры гаррайвыканкамаў, праўленне Беларускага саюза майстроў народнай творчасці пры рэгістрацыі ўдзельнікаў падчас адкрыцця выставы абавязкова падаюць арганізатарам арыгіналы спісаў у 2-х экзэмплярах, завераныя подпісам кіраўніка і пячаткай. (Дадатак 2)

14. Падчас закрыцця выставы адбудуцца навуковыя чытанні.

Асноўныя пытанні для абмеркавання:

Традыцыйныя віды творчасці ў наіўным мастацтве;

Навацыйныя віды творчасці ў наіўным мастацтве;

Захаванне і экспанаванне твораў інсітнага мастацтва. Музей-наіў, калекцыі ва ўстановах культуры, прыватныя зборы.

Перспектывы развіцця інсітнай творчасці і выставачнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Формы работы з інсітным аўтарам.

Заяўкі на ўдзел у навуковых чытаннях і тэкст выступлення неабходна даслаць да 1 красавіка 2025 года на электронны адрас: amcnt@omcnt.by; Аб'ём тэкста не болей 1 друкарскага аркуша, рэдактар Word шрыфт Times New Roman 14 пт, інтэрвал 1,5; палі 2,5 см. Спасылкі на літаратуру даюцца ў канцы тэкста, дапушчальныя фотаздымкі.

15. Кожны ўдзельнік выставы атрымлівае дыплом і зборнік матэрыялаў пасля яго выдання. Уладальнік Гран-пры і пераможцы за I месца ў кожнай намінацыі атрымліваюць прызы (усяго 5 прызоў).

16. Фінансавае забеспячэнне:

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці забесяспечвае: выраб рэкламы, дыпломаў, выданне матэрыялаў выставы (зборнік-каталог), пражыванне і харчаванне ўдзельнікаў навуковых чытанняў, набыццё прызоў.

16.1 Транспартныя выдаткі ўдзельнікаў навуковых чытанняў, а таксама выдаткі на дастаўку і вяртанне экспанатаў ажыцяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

16.2 Даведкі па тэлефонах у Віцебску: 8 0212 26-29-40 – загадчык сектара па выставачнай дзейнасці Перліна Ганна Вадзімаўна.

*Дадатак 1*

**Заяўка на ўдзел ў Рэспубліканскай выставе інсітнага (наіўнага) мастацтва ”Інсіта - 2025“, прысвечаная 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.**

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, тэлефон | Назва ўстановы, якую прадстаўляе ўдзельнік | Назва творчай работы, год выканаresня, памеры, тэхніка |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | | | |

*Дадатак 2*

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела
культуры
___________________________
(подпіс, прозвішча, ініцыялы)
_______________ 2025
М.П.

**СПІС**
**удзельнікаў Рэспубліканскай выставы інсітнага (наіўнага) мастацтва ”Інсіта - 2025“, прысвечаная 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне**

________________________________________________________________
(назва ўстановы і раёна, якія прадстаўляюць мастакоў)

дата з_____ па_____ г.Віцебск

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Год нарад-жэння | Пашпартныя дадзеныя, калі і кім выдадзены | Адрас | Роля ў калектыве |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | Удзельнік |
| | | | | | УСЯГО: |

Неабходнасць жылля (указаць колькасць) ___________________________________

Марка транспарта з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку вадзіцеля
___________________________________________________________________________

Дырэктар ____________________ ________________________
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзенні абласной выставы-конкурсу прадметаў побыту ”У гаспадара і гаспадыні“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласной выставы-конкурсу прадметаў побыту ”У гаспадара і гаспадыні“ (далей – выстава-конкурс).

2. Выстава-конкурс праводзіцца ў мэтах агляду збораў (фондаў) артэфактаў этнаграфіі, сабраных рознымі ўстановамі культуры на тэрыторыі сучаснай Віцебскай вобласці ці памежжа, у выніку правядзення экспедыцыйных даследаванняў з мэтай зберажэння ўнікальных помнікаў побыту і традыцыйнай культуры; агляду адноўленных традыцыйных для рэгёна побытавых рэчаў і прыладаў, якімі карысталіся ў гаспадарцы; увасаблення ў мастацкіх вобразах, інсталяцыях, мініяцюрах вясковага жыцця, клапатлівую працы па гаспадарцы.

3. Месца і дата правядзення: выставачная зала ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А), ліпень 2025 года

4. Арганізатары: упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“

5. Арганізатары зацвярджаюць парадак арганізацыі і правядзення выставы-конкурсу.

6. Удзельнікі: супрацоўнікі дамоў (цэнтраў) рамёстваў Віцебскай вобласці; члены студый і клубаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў пры ўстановах культуры Віцебскай вобласці, якія з’яўляюцца захавальнікамі музейных збораў ці этнаграфічных хатак і куточкаў, музеі і музейныя комплексы.

7. Парадак правядзення.

На выставу-конкурс прадстаўляюцца экспанаты, артэфакты, помнікі побыту і традыцыйнай культуры, сабраныя падчас экспедыцыйнай работы. Аднoўленыя рэчы, якія маглі выкарыстоўвацца ў гаспадарцы, у хаце, у майстэрні, у кузні, у лазні і г.д. ва ўладаннях гаспадара, альбо гаспадыні. Адлюстраванне працы гаспадара і гаспадыні ў мастаціх вобразах, інсталяцыях, мініяцюрах.

Пры падрыхтоўцы экспанатаў да выставы-конкурсу рэкамендуецца надаць асаблівую ўвагу тым артэфактам, якія ў далейшым могуць стаць перспектыўнымі элементамі НКС, належаць да ўзораў найлепшых праяў традыцыі рамяства, побытавых рэчаў ці твора народнай творчасці.

8. Намінацыі

”Захаванне і ўнікальнасць гістарычных артэфактаў“. Прымаюць удзел этнаграфічныя побытавыя рэчы.

”Лепшая рэпліка прадмету побыту гаспадара“. Да ўдзелу ў дадзенай намінацыі дапускаюцца аднoўленыя рэчы, прадметы, прылады працы, якія мог выкарыстоўваць гаспадар, якія маюць традыцыйны характар для Віцебскай вобласці ці памежжа.

”Лепшая рэпліка прадмету побыту гаспадыні“. Да ўдзелу ў дадзенай намінацыі дапускаюцца аднoўленыя рэчы, прадметы, прылады працы, якія магла выкарыстоўваць гаспадыня, якія маюць традыцыйны характар для Віцебскай вобласці ці памежжа.

”Мастацкія вобразы ”У гаспадара і гаспадыні“. Прымаюць удзел мастацкія работы, інсталяцыі, мініяцюры, якія адлюстроўваюць традыцыйныя побытавыя рэчы, замалёўкі, жыццёвыя моманты.

9. Асноўныя крытэрыі адбору вырабаў для ўдзелу ў выставе: адпавяданне мэтам і задачам згодна пункту 2 дадзенага палажэння, ступень даследаванасці традыцый, правядзенне фіксацыі пашпартных дадзеных артэфактаў, гісторыі бытавання, асаблівасцяў рамесніцкіх прыёмаў, мясцовай сыравіны і матэрыялаў, наяўнасць прадстаўленных на выставу метадычных распрацовак, друкаваных выданняў, публікацый і інш. Пры наяўнасці шэрагу прадметаў аднолькавай тэхнікі абавязкова трэба зрабіць аналіз калекцыі і прадставіць на выставу-конкурс тыя вырабы, якія дасканала характарызуюць традыцыю. Для аднoўленых работ асабістую ўвагу надаць якасці рэканструкцыі, гісторыі бытавання, традыцыйны характар для мясцовасці.

Колькасць прадстаўленых прадметаў абмежавана магчымасцямі экспазіцыйнай прасторы залы ВАМЦНТ, а таксама іх якасцю і неабходнасцю экспанавання (пры вялікай колькасці артэфактаў неабходна папярэдняе ўзгадненне з куратарам па адбору для іх прадастаўлення на выставу-конкурс). Прадметы павінны мець прыстасаванні для мантажу, быць падпісаны на адваротным баку экспаната і мець экспазіцыйныя этыкеткі з поўнай інфармацыяй: назва ўстановы з эмблемай; прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, год нараджэння; назва твора, матэрыял і тэхніка выканання, памер.

10. Заяўкі і спіс на ўдзел дасылаюцца ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ на электронны адрас: amcnt@omcnt.by да 10 чэрвеня 2025 года.

11. Узнагароджванне.

Дыпломамі ўзнагароджваюцца пераможцы выставы-конкурсу: уладальнікі, I, II, III ступені кожнай намінацыі. Прызамі ўзнагароджваюцца ўладальнікі дыпломаў I ступені ў кожнай намінацыі. Астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у электронным выглядзе.

12. Фінансаванне.

12.1 Фінансаванне ажыццяўляецца за кошт арганізатараў выставы-конкурсу ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

12.2. Транспартныя выдаткі на дастаўку і вяртанне экспанатаў– за кошт камандзіруючых устаноў.

**Кантактная інфармацыя:**

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8 (0212) 26-29-27.

**Тэлефон для даведак:** 8(0212) 26-29-40– Перліна Ганна Вадзімаўна, загадчык сектара па выставачнай дзейнасці.

*Дадатак 1*

**Заяўка**
**на ўдзел у абласной выставе-конкурсу прадметаў побыту**
**”У гаспадара і гаспадыні“**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць майстар) | |
| Назва арганізацыі і раёна, які прадстаўляе аўтар | |
| Назва твора | |
| Матэрыял,тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

*Дадатак 2*

**Спіс**
**мастацкіх вырабаў**
**на ўдзел у абласной выставе-конкурсу прадметаў побыту**
**”У гаспадара і гаспадыні“**

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па-бацьку аўтара | Назва ўстановы | Назва творчай работы | Намінацыя |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/
*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб арганізацыі і правядзенні сумеснага выставачнага праекта ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і УК ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“ па інсітнаму мастацтву ”Погляд мастака“, прысвечанага 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне“**

1. Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення сумеснага праекта дзяржаўнай установы ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай

творчасці“ і установы культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“ па інсітнаму мастацтву ”Погляд мастака“, прысвечанага 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне“ (далей - выстава).

2. Выстава праводзіцца з мэтай стымулявання працэсаў развіцця інсітнага (наіўнага) мастацтва, выяўлення новых талентаў і садзейнічае іх творчаму раскрыццю; папулярызацыі інсітнага мастацтва сярод шырокіх слаёў грамадства; наладжвання творчага супрацоўніцтва ў сферы інсітнага мастацтва з раённымі ўстановамі культуры Віцебскай вобласці.

3. Арганізатарамі выставы з'яўляюцца: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, установа культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“ дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

4. Арганізатары выставы зацвярджаюць парадак яе арганізацыі і правядзення, каштарыс выдаткаў, вырашаюць іншыя пытанні па яе правядзенні.

5. Час і месца правядзення выставы будзе вызначаны графікам экспанавання і асобнымі дамовамі з установамі культуры Віцебскай вобласці, чэрвень – снежань 2025 года.

6. Удзельнікамі выставы з'яўляюцца мастакі-аматары наіўнага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура малых форм), майстры народных мастацкіх рамёстваў.

7. Арганізатары выставы пакідаюць за сабой права змяняць колькасць работ і мастацкую канцэпцыю экспазіцыі пры экспанаванні ў раённых установах культуры Віцебскай вобласці. Колькасць і адбор работ удзельнікаў будзе кожны раз вызначацца памерамі экспазіцыйных плошчаў асобна ўзятай установы і неабходнасцю стварэння цэласнага мастацкага праекта.

8. Парадак правядзення выставы.

8.1 Для арганізацыі і правядзення выставы ствараецца рабочая група, якая складаецца з прадстаўнікоў установы культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“ і дзяржаўнай установы ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр ароднай творчасці“. Рабочая група:

узгадняе месца і дату правядзення выставы ў раённых установах культуры;

вызначае колькасць творчых работ, якія ўдзельнічаюць у канкрэтных выставачных праектах;

садзейнічае інфармацыйнаму суправаджэнню правядзення выставы (прэс-рэліз, рэклама, афішы, анатацыі).

8.2. Установа культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“:

прымае на захоўванне творчыя работы ўдзельнікаў выставы са складаннем адпаведнага акта прыёму на часовае карыстанне. Падпісваючы акт прыёму на часовае карыстанне, удзельнік выставы пацвярджае, што азнаёмлены са зместам гэтага Палажэння і дае арганізатарам выставы права экспанавання сваіх творчых работ у рамках рэалізацыі выставы.

заключае дагаворы аб аказанні паслуг па арганізацыі выставачнага праекта з раённымі ўстановамі культуры;

пакідае за сабой права змяняць колькасць работ і мастацкую канцэпцыю экспазіцыі пры экспанаванні ў раённых установах культуры Віцебскай вобласці.

Колькасць і адбор работ удзельнікаў будзе кожны раз вызначацца памерамі экспазіцыйных плошчаў асобна ўзятай установы і неабходнасцю стварэння цэласнага мастацкага праекта.

8.3. Дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“:

забяспечвае ўдзел у адкрыцці выстаў спецыялістаў і арганізуе ўдзел экспанентаў;

забяспечвае рэкламу выставы, дае інфармацыю ў СМІ;

выдае экспанентам сертыфікаты, якія пацвярджаюць удзел у выставе;

ажыццяўляе транспарціроўку мастацкіх твораў да першага месца экспанавання. Далей, згодна з графікам, на наступнае месца экспанавання выставу дастаўляюць арганізатары наступнага месца экспанавання творчых работ і г.д.

9. Раённыя ўстановы культуры:

прадастаўляюць для размяшчэння экспанатаў памяшканне, прыдатнае для экспанавання;

забяспечваюць захаванне экспанатаў на ўвесь перыяд іх знаходжання ў прымаючага боку (з моманту выдачы да моманту вяртання), а таксама своечасовае вяртанне экспанатаў;

фарміруюць спіс запрошаных з ліку прадстаўнікоў райвыканкама, СМІ, майстроў народных мастацкіх рамёстваў, мастакоў-аматараў і інш.;

удзельнічаюць у мантажы выставы, прадастаўляюць неабходнае абсталяванне і матэрыялы.

**Кантактная інфармацыя:**

Установа культуры ”Віцебскі абласны краязнаўчы музей“: г.Віцебск, вул. Леніна, 36, каб. №79 тэл.: + 375(212)66-05-45, а таксама па электронным адрасе: vokm79@mail.ru

Дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ 210026, г. Віцебск, вул. Леніна, в. 35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8 (0212) 26-29-27

**Тэлефон для даведак:** 8 (0212) 26-29-40 – Перліна Ганна Вадзімаўна, загадчык сектара па выставачнай дзейнасці.

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб парадку арганізацыі і рэалізацыі сумеснага праекта ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ і ДУА ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі“ ”Код майстэрства“: семінары, выставы, майстар-класы для педагогаў, навучэнцаў гурткоў на базе Віцебскага АМЦНТ

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і рэалізацыі сумеснага праекта ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ і ДУА ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі“ ”Код майстэрства“: семінары, выставы,

майстар-класы для педагогаў, навучэнцаў гурткоў на базе Віцебскага АМЦНТ (далей – праект).

2. Праект праводзіцца ў мэтах папулярызацыі фальклорнай спадчыны і традыцыйнай культуры Віцебшчыны; падтрымкі і развіцця творчай ініцыятывы педагогаў па папулярызацыі і распаўсюджванню традыцыйнай культуры і народнай мастацкай творчасці; выхавання павагі да традыцыйнай культуры сярод педагогаў і навучэнцаў; павышэння прафесійнага ўзроўню і абмен вопытам паміж педагогамі; выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі і стварэнне ўмоў для развіцця іх творчай дзейнасці.

3. Арганізатары праекта: дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі“.

4. Праект уключае ў сябе шэрах семінараў па розных накірунках традыцыйнай культуры і падзяляецца на два тэматычных блока:

– першы блок: наведваннне педагогамі і навучэнцамі выстаў з экскурсіямі, якія арганізоўваюцца згодна плану марапрыемстваў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“;

– другі блок: наведваннне педагогамі і навучэнцамі майстар-класаў і практычных заняткаў з удзелам майстроў народных мастацкіх рамёстваў Віцебскай вобласці; творчыя сустрэчы з майстрамі-носьбітамі статуса ”Народны майстар Рэспублікі Беларусь“.

5. Месца правядзення семінараў у межах праекта: дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“; дамы (цэнтры) рамёстваў Віцебскай вобласці.

6. Час рэалізацыі праекта: на працягу 2025 года.

7. Арганізатары зацвярджаюць парадак арганізацыі і правядзення марапрыемстваў у межах праекта, вырашаюць іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні праекта.

8. Удзельнікамі выступаюць навучэнцы, педагогі дадатковай адукацыі г.Віцебска;

9. Умовы правядзення:

9.1. Супрацоўнікі ДУА ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі“ забяспечваюць удзел у мерапрыемстве педагогаў і навучэнцаў, прадастаўляюць у ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“ спіс удзельнікаў мерапрыемства.

9.2. Супрацоўнікі ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ забяспечваюць арганізацыю выстаў і экскурсій згодна плану работы ДУ ”Віцебскі АМЦНТ“, падрыхтоўку і правядзенне семінараў і майстар-класаў, запрашэнне майстроў народных мастацкіх рамёстваў для абмену практычным вопытам.

**Кантактная інфармацыя:**

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ 210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by, тэл./факс: 8(0212) 26-29-27.

**Тэлефон для даведак:** 8(0212) 26-29-40 – Лапкова Таццяна Анатольеўна, загадчык аддзела традыцыйнай культуры.
ДУА ”Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі“
г.Віцебск, вул.Касманаўтаў, д.2, тэл./факс: 8(0212) 67-65-44.
**Тэлефон для даведак:** 8(033) 324-44-70 – Аксана Валер’еўна Мяшкова, метадыст.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення выставы-продажу навагодніх вырабаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў ”Калядны карагод“**

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення выставы-продажу навагодніх вырабаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў ”Калядны карагод“ (далей – выстава-продаж).

2. Выстава-продаж праводзіцца ў мэтах папулярызацыі мастацкіх вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; арыентавана на аднаўленне традыцыйных і распрацоўку арыгінальных елачных цацак, навагадодніх сувеніраў, кампазіцый і абуджэнне крэатыўнага мыслення майстроў народнай творчасці. Дадзеная выстава-продаж павінна прадэманстраваць традыцыі святкавання Новага Года і Калядаў, ролю елачных цацак і ўпрыгожванняў у сістэме беларускай народнай культуры; прыцягнення ўвагі моладзі да традыцыйнай культуры і творчасці вядучых майстроў Віцебскай вобласці; фарміравання эстэтычнага густу насельніцтва на ўзорах творчасці майстроў.

3. Месца і дата правядзення: выставачная зала ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ (г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А), снежань 2025 года – студзень 2026 года.

4. Арганізатар: дзяржаўная ўстанова ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

5. Арганізатар зацвярджае парадак арганізацыі і правядзення выставы-продажу, каштарыс выдаткаў, вырашае іншыя пытанні па арганізацыі і правядзенні.

6. Удзельнікі: майстры дамоў (цэнтраў) рамёстваў; члены народных клубаў (студый) майстроў народных мастацкіх рамёстваў і мастакоў-аматараў устаноў культуры Віцебскай вобласці; члены Беларускага саюза майстроў Віцебскай вобласці.

7. Парадак правядзення:

7.1. Асноўныя крытэрыі адбору вырабаў для ўдзелу ў выставе-продажы: адпаведнасць дадзенай тэматыцы; цэласнасць кампазіцыі; унікальнасць экспаната, арыгінальнасць ідэі і мастацка-вобразнага рашэння; майстэрства выканання і ступень мастацкага самавыяўлення; наяўнасць неабходнага афармлення работ.

7.2. Заяўкі на ўдзел дасылаюцца ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр

народнай творчасці“ на электронны адрас: amcnt@omcnt.by (з паметкай ”Калядны карагод“ **да 1 снежня 2025 года**. Да заяўкі дадаюцца каталожныя дадзеныя твора (назва твора, год стварэння, матэрыялы і тэхніка выканання, памер), дадзеныя аўтара, творчыя характарыстыкі майстроў, спіс і фотаздымкі вырабаў, якія будуць пададзены на выставу-продаж.

7.3. На выставу прадстаўляюцца вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва майстроў народных мастацкіх рамёстваў, выкананыя ў розных тэхніках з традыцыйных і арыгінальных матэрыялаў, вырабы з прыроднага і штучных матэрыялаў, такія як: дэкаратыўныя елкі, елачныя цацкі і ўпрыгожванні, навагоднія сувеніры, лялькі і цацкі, карункі, кампазіцыі і інсталяцыі на тэму Раства, Новага года і Каляд.

7.4. Памеры прадстаўленых вырабаў народнай творчасці не абмяжоўваюцца, павінны мець прыстасаванні для мантажу, быць падпісаны на адваротным баку і мець экспазіцыйныя этыкеткі з поўнай інфармацыяй (назва ўстановы з эмблемай, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара; год стварэння твора; назва твора; матэрыял і тэхніка выканання; памер).

7.5. Завоз экспанатаў **да 8 снежня 2025 года** ў ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“ па адрасе: г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А (аддзел традыцыйнай культуры).

7.6. Мантаж экспазіцыі здзяйсняюць супрацоўнікі ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“.

8. Фінансаванне.

8.1. Транспартныя выдаткі на дастаўку і вяртанне экспанатаў – за сродкі камандзіруючых устаноў.

**Кантактная інфармацыя:**

ДУ ”Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“,
210026, г.Віцебск, вул.Леніна, д.35А, e-mail: amcnt@omcnt.by,
тэл./факс: 8 (0212) 26-29-27.
Тэлефон для даведак: 8(0212) 26-29-40, 8(0212)26-29-58 – Кіркавец Марына Аляксандраўна, вядучы метадыст.

*Дадатак 1*

**Заяўка**
**на ўдзел у абласной выставе-продажу вырабаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў ”Калядны карагод“**

| | |
|---|---|
| Дадзеныя аўтара(аў) (П., І., імя па бацьку, тэлефон, год нараджэння, назва студыі/клуба, у які ўваходзіць майстар) | |
| Назва арганізацыі і раёна, які прадстаўляе аўтар | |
| Назва твора | |
| Матэрыял,тэхніка выканання | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/

*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*

*Дадатак 2*

**Спіс**

**мастацкіх вырабаў на ўдзел у абласной выставе-продажу вырабаў майстроў народных мастацкіх рамёстваў ”Калядны карагод“**

| № п/п | Найменне ,фота выраба | Матэрыял, тэхніка выканання выраба | Памер выраба | Колькасць | Кошт |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| | | | | | |

Кіраўнік установы /__________/ /_____________/

*М.П.* *Подпіс* *Расшыфроўка*